КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 52 (1699) | 27 снежня 2024 г.

З НОВЫМ ГОДАМ!

Падчас прэм'еры казкі "Як мядзведзь Патапыч Новы год ратаваў". Фота Уладзіміра ШЛАПАКА.
Працяг тэмы на стар. 15

9 771994 478007 24052

Гэта і для нас важна

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 16 снежня наведаў Нацыянальны музей Амана ў горадзе Маскат.

— У Мінску пачынаюць узвядзенне новага будынка Нацыянальнага музея гісторыі, а таму важна паглядзець, як такія музеі абсталяваны ў іншых краінах свету, вывучыць вопыт, — сказаў Кіраўнік нашай дзяржавы падчас экскурсіі па аманскай скарбніцы.

Яна размешчана насупраць султанскага палаца Аль-Алам. Дэкрэт аб узвядзенні музея быў выдадзены 25 лістапада 2013 года. Афіцыйнае адкрыццё прайшло 30 ліпеня 2016-га.

Агульная плошча будынка складае 13,7 тысячы квадратных метраў, з якіх 4 тысячы адведзена пад 14 экспазіцыйных зал. Гэта “Зямля і людзі”, “Хараставо ісламу”, “Аман і свет”, а таксама галерэі марской гісторыі, зброі, брані, нематэрыяльнай спадчыны, Афладжа (ірыгацыйная сістэма ў Амане) і іншыя. Часовыя выставы займаюць 400 квадратных метраў.

У 2018 годзе Нацыянальны гістарычны музей Беларусі і Нацыянальны музей Султаната Аман падпісалі мемарандум аб узаемаразуменні. У выніку скарбніцы абменьваюцца экспазіцыямі.

“Утэўнены, што працяг практыкі ўзаемных выстаў нацыянальных музеяў нашых краін адкрые новыя гарызонты для ўмацавання сувязей паміж Беларуссю і Аманам, пашырэння магчымасцей абмену вопытам даследчыкамі і спецыялістамі ў галінах навукі, культуры і музейнай справы. Жадаю кіраўніцтву і супрацоўнікам музея новых поспехаў і дасягненняў. Няхай ваша ўдзячная работа дапамагае адкрываць новыя нязведаныя старонкі мінулага, прадаўжае натхняць будучыя пакаленні на захаванне і вывучэнне найбагацейшай спадчыны Амана”, — такі запіс лідар пакінуў у кнізе ганаровых гасцей.

Экскурсію для Прэзідэнта правёў генеральны сакратар музея Жамаль аль-Мусаві. Вітаючы яго ля ўвахода ва ўстанову, Аляксандр Лукашэнка заўважыў: “Кажуць, тут наш беларус ёсць!” Справа ў тым, што маці Жамаля аль-Мусаві — ураджэнка Беларусі, а сам ён выдатна гаворыць па-руску.

— Можа, калі пад'едзеце, падкажаце, што як, — прапанаваў Кіраўнік дзяржавы, распавядаючы пра ўзвядзенне новага будынка Нацыянальнага музея гісторыі. Жамаль аль-Мусаві заявіў аб гатоўнасці садзейнічаць.

Што датычыцца Нацыянальнага музея Амана, ён падпарадкоўваецца Султану Амана і з'яўляецца стратэгічнай установай. “Мы займаемся пытаннямі нацыянальнай ідэнтычнасці. Пытаннямі, хто мы ў глабальным свеце”, — паведаміў генеральны сакратар скарбніцы.

— Гэта і для нас важна, — пацвердзіў Прэзідэнт.

Падрабязнасці — на сайце president.gov.by

Дарагія калегі, шаноўныя сябры!

Сардэчна віншую вас з надыходам самых чароўных свят – Новага года і Каляд!

Жадаю сустрэць іх цудоўным настроем, незабыўнымі эмоцыямі і ўражаннямі.

Традыцыйна ў апошнія дні года, што становіцца гісторыяй, мы згадваем яго самыя радасныя імгненні, падводзім вынікі і думаем пра будучыню. А яна як пункт адліку для новых спраў і планаў, новых здзяйсненняў і ажыццяўлення самых запаветных жаданняў.

Шчыры дзякуй за плённае супрацоўніцтва ў 2024-м! Вы былі ў авангардзе святкавання найбольш знакавых для нашай Айчыны падзей і памятных дат, што яднаюць грамадства.

Няхай жа 2025-ы – юбілейны год Вялікай Перамогі – нясе ўсім нам мір і дае імпульс для далейшага паспяховага руху наперад. Жадаю скараць усё новыя адметныя творчыя вяршыні. Будзьце заўжды здаровыя і шчаслівыя! Незабыўных вам свят. Няхай у гэты казачны час побач будуць дарагія сэрцу людзі!

З Новым годам!

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Р. І. Чарнецкі

Свята — кожнаму дзіцяці

Рэспубліканская навагодняя дабрачынная акцыя "Нашы дзеці" крочыць па краіне, шчодра дорачы маленькім беларусам зімовую казку.

Ініцыяваны Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам амаль 30 гадоў таму святочны марафон стукае ў дзверы бальніц, дамоў-інтэрнатаў, завітвае ў апякунскія і прыёмныя сем'і, цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі. Дзяржава клапоціцца, каб напярэдадні Новага года і Раства кожнае дзіця адчула цеплыню, дапамогу і, безумоўна, атрымала падарунак.

Прадстаўнікі органаў улады, кіраўнікі прадпрыемстваў, ведамстваў, грамадскіх аб'яднанняў на час ператвараюцца ў добрых чараўнікоў і наведваюць хлопчыкаў і дзяўчынак, якія трапілі ў складаныя жыццёвыя абставіны.

Так, 18 снежня ў Вілейскую спецыяльную школу-інтэрнат прыехалі ўдзельнікі акцыі “Нашы дзеці” на чале з міністрам культуры Русланам Чарнецкім.

— Хачу пажадаць вам знайсці сябе ў гэтым жыцці, займацца справай, якую вы будзеце любіць. І тады вы будзеце шчаслівыя, — звярнуўся да выхаванцаў інтэрната Руслан Іосіфавіч. — Я вельмі хачу, каб кожны з вас быў шчаслівы. Ну а мы, дарослыя, дапаможам у гэтым.

Хакейныя канькі і прысмакі сталі для дзяцей карыснымі і прыемнымі падарункамі. Іх падрыхтавалі пры ўдзеле Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а таксама Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму.

Удзячная дзятва пацешыла гасцей талентамі і запрасіла ў карагод.

Графік асабістага прыёму грамадзян у Міністэрстве культуры:

КУЛЬТУРА Культура і Мастацтва МАСТАЦТВА

№1 05.01 2024 №52 27.12

Ілюстраваны каталог выбраных публікацый газеты “Культура” (2024 год)

нясі культуру, жыві мастацтвам

Культура са знакам якасці

На развітанне з Годам якасці мы вырашылі зрабіць для чытачоў падарунак: ілюстраваны каталог выбраных публікацый газеты “Культура” дазволіць азірнуцца і прыгадаць самыя яскравыя падзеі 2024-га. Маляўнічыя старонкі няхай і не ўмяшчаюць усе шматлікія імпрэзы, што ладзіліся рупліўцамі сферы сёлета, але ж стваракоўць святочны настрой і напаўняюць сэрцы гордасцю за нашых таленавітых людзей, удзячнасцю дзяржаве і любоўю да Радзімы.

Стымуляванне ініцыятывы, фарміраванне ў грамадстве адказнасці за вынікі сваёй працы і пачуцця прыналежнасці да будучыні краіны — Указ № 375 “Аб абяўленні 2024 года Годам якасці” Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў летась у мэтах далейшага павышэння якасці жыцця беларускага народа.

Цягам года намаганні былі сканцэнтраваны на выкананні якасных паказчыкаў — праз заахвочванне ініцыятывы, укараненне рацыяналізатарскіх ідэй, умацаванне сацыяльнага аптымізму, імкнення стварэць на агульную карысць. Прыярытэтам стала фарміраванне ў грамадзян адказнасці за дасягненне высокай якасці жыцця. Увагу засяродзілі і на культурным баўленні вольнага часу.

Вырашэнню такой істотнай задачы, запатрабаванай дзяржавай, актыўна спрыяла наша галіна. Пра плённую працу яе прадстаўнікоў сведчыць кожная старонка газеты — за 2024 год свет пабачыла 52 маляўнічыя нумары. Гэта 832 друкаваныя паласы культурнага летапісу краіны. Факты, падзеі, імёны, фота — пераканаўчае адлюстраванне таго, як рупліўцы сферы ставяцца да справы.

Сёлета мы жылі пад знакам 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Працаўнікі культуры праз таленавітую самадзейную дзейнасць распавядалі аб неўміручасці народнага подзвігу, а наша газета асвятляла самыя важныя тварэнні. Да прыкладу, у межах цыкла “80 мірных гадоў” са студзеня па снежань выйшла больш за 100 публікацый. Шмат цікавага адбывалася да 100-годдзя беларускага кіно — надрукавана звыш 70 матэрыялаў у розных жанрах. Таксама ў кожным нумары з'яўляліся тэксты, што датычацца прафесійнага мастацтва, народнай творчасці, устаноў адукацыі, міжнароднага супрацоўніцтва, аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Пільная ўвага ўдзялялася дзяржаўным спецыяльным культурным мерапрыемствам і рэгіянальным брэндавым святам. Мы не абміналі і пытанні фінансава-эканамічнага плана, капітальнага будаўніцтва.

Так, за 2024 год было надрукавана каля 110 матэрыялаў пра музеі, звыш 80 — пра тэатры, з паўсотню — пра ўстановы адукацыі ў сферы культуры, амаль 70 — пра кінасправу і столькі ж — пра работу клубаў, канцэртных арганізацый і цыркаў. Дзейнасць устаноў нашай галіны раскрываецца на старонках газеты не толькі ў шматлікіх рэпартажах і нататках пра мерапрыемствы, але ў аналітычных артыкулах, нарысах і партрэтных замалёўках — праз асобу. Інтэрвію з пераможцамі міжнародных і нацыянальных конкурсаў, юбілярамі, прадстаўнікамі сферы, адзначаным важнымі ўзнагародамі, а таксама са стыпендыятамі і з лаўрэатамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі выходзяць у кожным нумары. Толькі ў рубрыцы “Мастацкім маладых” пабачыла свет звыш 20 артыкулаў, якія распавядаюць пра адоранных студэнтаў і навучэнцаў устаноў адукацыі нашай галіны. Праект “Культура ў асобах” расказваў пра выбітных дзеячаў у інфаграфіцы.

Рубрыка “Каляндар брэндавых свят” уключыла каля 130 публікацый, “Спадчына” — амаль 60, “Культурная дыпламатыя” — больш за 50. А новы цыкл “Пад увагай Першага”, у межах якога са жніўня надрукавана звыш 20 тэкстаў, акцэнтуе ўвагу чытачоў на аб'ектах, захаваных і адчуўленых дзякуючы падтрымцы Кіраўніка дзяржавы.

Зрэшты, лічыце самі: поўныя версіі матэрыялаў з газеты “Культура” шукайце на нашым сайце. QR-код — у дапамогу!

kultura-info.by

Сто гадоў на варце спадчыны

2024 02

КУЛЬТУРА
№ 6
люты 2024

Летась споўнілася 30 гадоў з даты стварэння Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, але агулам гісторыя фарміравання сістэмы дзяржаўнага ўліку і аховы аб'ектаў нацыянальнай спадчыны Беларусі ахоплівае ўжо больш як векавы перыяд. Як развівалася сістэма аховы помнікаў у Беларусі?

Працяг тэмы — на сайце kultura-info.by

Зямля таленавітых людзей

Сёлетняя культурная сталіца Беларусі — гарадок не самы вялікі. У Бялынічах жывуць каля 10 тысяч чалавек. Але райцэнтр можа пахваліцца важкімі набыткамі. "К" даведалася пра спадчыну і сучаснае творчае жыццё гэтага краю.

Працяг тэмы — на сайце kultura-info.by

2024 03

КУЛЬТУРА
№ 9
сакавік 2024

2024 06

КУЛЬТУРА
№ 24
чэрвень 2024

Кола сяброўства

XIV Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур аб'яднаў больш за 800 прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, якія ў чарговы раз таленавіта і шматгранна прэзентавалі свае культуры. Традыцыйнае свята, што праходзіла ў Гродне з 7 да 9 чэрвеня, зноў прадэманстравала згоду і лад, якія пануюць у нашым грамадстве, і стала сапраўдным сімвалам адзінства народаў Беларусі. У коле сяброўства сабраліся азербайджанцы, аргенцінцы, армяне, афганцы, башкіры, бураты, грэкі, грузіны, дагестанцы, егіпцяне, індыйцы, італьянцы, казахі, кітайцы, карэйцы, ланкійцы, літоўцы, малдаване, мардвіны, немцы, пакістанцы, палякі, рома, рускія, татары, туркмены, узбекі, украінцы, чувашы, эстонцы, яўрэі... Зрэшты, глядзіце самі.

Працяг тэмы — на сайце kultura-info.by

2024 07

КУЛЬТУРА
№ 28
ліпень 2024

Купальскі вянок

Фестываль "Александрыя збірае сяброў" з маленькага ўтульнага свята ператварыўся ў падзею міжнароднага маштабу.

Працяг тэмы — на сайце kultura-info.by

Фестывальнае лета “па-віцебску”

“Славянскі базар у Віцебску” даўно стаў адным з самых яркіх брэндаў Беларусі. З кожным годам фестываль набірае абароты, і штосьці на ім адбываецца упершыню. Сёлета такіх навінак — больш, чым калі. Сярод самых значных — Дзень нацыянальных культур краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Але былі і іншыя дэбюты.

Працяг тэмы — на сайце kultura-info.by

2024 07
КУЛЬТУРА
№ 29
ліпень 2024

Памяць як трава, што зноў прарастае

28 ліпеня 1944-га войскі 1-га Беларускага фронту штурмам узялі Брэст і выбілі часці СС з мястэчка Высокае. Так 80 гадоў таму завяршылася вызваленне цяперашняй тэрыторыі Беларусі. Гэтая падзея вызначыла лёс і далейшае жыццё нашай нацыі. І ці ж выпадае здзіўляцца, што на доўгія гады вайна стала адной з галоўных тэм для беларускага мастацтва? На гэтую тэму сказана ўжо шмат — і гаворыцца сёння. Ды выстава “Зямля крывавіць гісторыяй”, падрыхтаваная Нацыянальным цэнтрам сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь, вылучаецца сярод многіх іншых, прымеркаваных да памятнай даты.

Працяг тэмы — на сайце kultura-info.by

2024 07
КУЛЬТУРА
№ 30
ліпень 2024

2024 08
КУЛЬТУРА
№ 34
жнівень 2024

Галоўнае хлебнае свята краіны

Пад лозунгам “Мір. Гаспадар. Дабрабыт” прайшоў 17 жніўня ў Свіслачы III каравай-фэст “Бацькава булка”. Мерапрыемства, якое ўжо стала на Гродзеншчыне брэндавым, сёлета было прысвечана 30-годдзю інстытута прэзідэнцтва і 80-годдзю вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Спойлер: булак хапіла на ўсіх!

Працяг тэмы — на сайце kultura-info.by

2024 08
КУЛЬТУРА
№ 34
жнівень 2024

Гамоніць запаветны край

Таленты з усяго Прыпяцкага Палесся чарговы раз сабраліся ў аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна. На гэтай маляўнічай старонцы адспяваў і адтанчыў VIII Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый “Кліч Палесся”.

Працяг тэмы — на сайце kultura-info.by

“Анімаёўка-2024”: энергія будучыні

Дваццаць сёмы раз Беларусь сустракала адну з самых яркіх культурных падзей — Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў “Анімаёўка”. Фэст аб’ядноўвае таленты з розных краін, у тым ліку дзяцей і моладзь, і дае ім магчымасць прадэманстраваць шырокай публіцы свае найлепшыя работы, а гледачам — пазнаёміцца з дасягненнямі ў галіне вытворчасці анімацыйнага кіно. А яшчэ “Анімаёўка” — гэта заўсёды яскрава, весела і цікава!

Працяг тэмы — на сайце kultura-info.by

2024 10
КУЛЬТУРА
№ 40
кастрычнік 2024

Велічны маштаб

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета выпусціў прэм’еру ў гонар 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — “Патэтычны дзённік памяці”.

Працяг тэмы — на сайце kultura-info.by

2024 10
КУЛЬТУРА
№ 41
кастрычнік 2024

2024 11
КУЛЬТУРА
№ 45
лістапад 2024

Грандыёзна і гучна — тэта быў “Лістапад”

XXX Мінскі міжнародны кінафестываль “Лістапад” завяршаецца.
Сёння увечары ў Палацы Рэспублікі падвядуць яго вынікі.
Але ўжо зараз можна сказаць: маштаб юбілейнага кінафоруму ўразіў.

Працяг тэмы — на сайце kultura-info.by

KULTURA-INFO.BY

“Навагодзім” па-новаму

Святочныя ранішнікі ладзіць, бадай, кожны тэатр. І штогод да ўпадабаных дзятвой спектакляў далучаюцца прэм’ерныя. Сярод іх — як зімовыя гісторыі вядомых аўтараў, так і спецыяльна напісаныя навінкі.

Маладзёжны тэатр эстрады, як заўжды, цешыць хлопчыкаў і дзяўчынак захапляльнымі імпрэзамі адразу на дзвюх пляцоўках. У адміністрацыйным корпусе “Пераможцаў, 14” можна ўбачыць прэм’ерную казку **“Як мядзведзь Патапыч Новы год ратаваў”**. Прадстаўленні праходзяць у рамках рэспубліканскай акцыі “Нашы дзеці” з 24 снежня па 3 студзеня. Акрамя спектакля, гасцей чакаюць прыгожыя фотазоны, маляўнічыя інсталяцыі, інтэрактывы каля ялінкі. А на асноўнай сцэне тэатра паказваюць **“Ката ў матросцы і карову, якая танцуе”**. Адштурхнуўшыся ад персанажаў з Прастаквашына, мастацкі кіраўнік калектыву Уладзіслава Арцюхоўская прыдумала сваіх, склала і паставіла пра іх гісторыю. Дарэчы, у аповедзе з’явіўся смешны вожык Чых-Чых у бліскучым выкананні Інгі Кісялёвай.

Тэатр юнага гледача на ўсе канікулы запусціў **“Пінгвін-шоу! Усё будзе харашоу”**. Аўтарам і рэжысёрам выступіла знаная артыстка гэтай установы Ганна Джамілашвілі, якая ўсё часцей радуе не толькі шырокую публіку, але і прыдзірлівых крытыкаў цікавымі спектаклямі. Пінгвіны збіраюцца на спеўнае спаборніцтва, Чайка (Марыя Возба) з Бакланам (Генадзь Гаранскі) хочуць ім перашкодзіць, а потым далучаюцца са сваёй падтанцоўкай. Простая фабула конкурсных перыпетый, неаднойчы скарыстаная ў кіно і тэатры, набывае новыя адценні, аздабляецца пазнавальнымі пластычнымі абліччамі герояў. Відэа заснежаных краявідаў на задніку дапаўняюцца ялінкамі на сцэне, што нагадваюць празрыстыя ледзяшы (мастак Дар’я Волкава). А дарослым прызначаны спасылкі на драматургічную класіку — ад Чэхава да Шэкспіра.

Палац Рэспублікі і тэатральны праект “ТрыТфармаТ” пад кіраўніцтвам Веры Паляковай прадстаўляюць музычную казку **“Чароўны Зязя-Безабразя”** па п’есе Ягора Дземчанкі — пецярбургскага рэжысёра, заснавальніка фестывалю “Тарарабумбія”.

У смешнага памочніка Дзеда Мароза не ўсё ідзе на лад, але і ў гэтага персанажа з’яўляецца надзейная падтрымка. Гледачоў чакаюць не толькі вясёлыя прыгоды, выдатныя артысты і мора інтэрактыву (рэжысёр — Таццяна Самбук), але і чарада неверагодна прыгожых фотазон у фае малой залы. На ўсе густы! Аж вочы разбягаюцца.

А больш за ўсё вабіць, што тэатры адыходзяць ад збітых навагодніх сюжэтаў пра тое, як хтосьці хоча наўмысна сапсаваць свята, і шукаюць папраўдзе нешараговыя рашэнні.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота з архіва Маладзёжнага тэатра эстрады

Персанажы пастаноўкі “Як мядзведзь Патапыч Новы год ратаваў”

Сцэна з прадстаўлення “Кот у матросцы і карова, якая танцуе”

Як мядзведзь Патапыч Новы год ратаваў

Толькі зімой адбываюцца сапраўдныя цуды. Вялікі буры мядзведзь Міхайла Патапыч не жадае спаць у берлагу. Ён адкрыў кнігу чароўных казак і даведаўся, што Змей Гарыныч сабраўся выкрасці Новы год. Вызваляць свята адправіліся Дзед Мароз са Снягуркай. Паехалі, ды згубіліся. А хто дзяцей будзе віншаваць? Мядзведзь вырашыў надзець чырвоную шапку і ўзяць ўрачыстасці ў свае лапы. Паклікаў Івашку-Прастаквашку, мудраца і хітруна, ды і загадаў пайсці за трыдзевяць зямель да Гарыныча, каб выратаваць Новы год, Дзеда Мароза і Снягурку. Сам Міхайла Патапыч стаў збіраць падарункі для дзетак. Так і пачаліся прыгоды...

Казка пабудавана на інтэрактывах. Хлопчыкі і дзяўчынкі ператвараюцца ў яе непасрэдных удзельнікаў: разам з артыстамі і танцуюць, і гуляюць, і разгадваюць загадкі, і ў TikTok-батле спаборнічаюць. А пасля прадстаўлення Дзед Мароз і Снягурка запрашаюць усіх гасцей на сэлфі-марафон і ў карагод з героямі спектакля.

Афіша з 27 снежня па 3 студзеня

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20,
тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выставачны праект **“Кудрэвічы. Адданыя мастацтву”**, прымеркаваны да 140-годдзя з дня нараджэння заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Уладзіміра Мікалаевіча Кудрэвіча (1884—1957). **Да 13 студзеня.**
- Выстава **“Страты і вяртанні. Лёс мастацкіх каштоўнасцей Дзяржаўнай карцінай галерэі. 1939—1957”**, прымеркаваная да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 85-годдзя Нацыянальнага мастацкага музея. **Да 20 студзеня.**
- Экскурсіі: **“Самыя-самыя...” (6+), “Якога колеру зіма?” (6+), “Казкі Усходу” (10+), “Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма” (10+), “Партрэты даўнія мінулых пакаленняў...” (10+), “Пяць моў кахання” (16+), “Жаночы партрэт” (16+), “Мінск у музеі” (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ “ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ.”

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а,
тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Тэматычная праграма **“Раство ў Ваньковічаў”** з майстар-класам на вырабе навагодніх цацак і 3D-паштовак. **Да 15 студзеня.**
- Выстава жывапісу бытавога жанру XIX — пачатку XX стагоддзя **“Імгненні жыцця”** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея. **Да 18 студзеня.**
- Праграма **“Кафляныя «люстэркі» шляхецкай сядзібы”. Праводзіцца заўсёды.**
- Квэст **“Таямніцы старажытнай сядзібы”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Квэст **“Пошукі мінулага”. Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **“Інтэрэр шляхецкай сядзібы”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **“Шлях мастака Валенція Ваньковіча”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **“Сядзібны партрэт”**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца,
вул. Іванаўская, 176,
тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава **“Хронікі Музея беларускага народнага мастацтва. 45 гадоў”**, прымеркаваная да 45-годдзя з дня адкрыцця філіяла для наведвальнікаў. **Да 2 сакавіка.**
- **Батлеечны спектакль. Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **“Саломапляценне”. Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **“Лялька-мотанка”. Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **“Ткацтва”. Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203,
8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Art-lectorium **“Зразумелае мастацтва”. Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: **mdrama.by**

• Чароўная казка па матывах рускай народнай **“Іван-царэвіч і Шэры Воўк” (6+)**. Прэм’ера. **27 снежня ў 11.00, 28 снежня ў 11.00, 14.00 і 17.00, 29 снежня ў 11.00, 14.00 і 17.00, 31 снежня ў 11.00, 2 студзеня ў 11.00 і 14.00, 3 студзеня ў 11.00.**
• Пастаноўка “замест ліста” ў 1 дзеі **“Лілічка” (16+)**. **28 снежня ў 18.30.**
• Вадэвіль ў 2 дзеях **“Бяда ад пяшчотнага сэрца” (16+)**. **3 студзеня ў 18.30.**

УНП 700184039

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Спектакль для дзяцей **“Гісторыя шакаладнага дрэва” (0+)**. Чароўная казка пра двух юных эльфаў. Галоўная сцэна. **27 снежня ў 11.30, 28 снежня ў 17.00, 31 снежня ў 11.30, 3 студзеня ў 11.30, 4 студзеня ў 11.30 і 17.00, 5 студзеня ў 11.30.**
• Трагікамедыя **“Дзядзечкаў сон” (16+)**. Прэм’ера. Галоўная сцэна. **27 снежня ў 19.00.**
• Канцэрт у цемры **“Зімовая феерыя” (18+)**. Жывы гук. Імпрэза праводзіцца па вул. Валгаградскай, 35. **28 снежня ў 19.00.**
• Камедыя ў 2 дзеях **“Паўлінка” (12+)**. Галоўная сцэна. **29 снежня ў 11.30 і 19.00, 3 студзеня ў 19.00.**
• Спектакль **“Бясконцая гісторыя” (16+)**. Прэм’ера. Камерная сцэна. **4 студзеня ў 19.00.**
• Рэквіем у 1 дзеі **“Вечар” (12+)**. Галоўная сцэна. **5 студзеня ў 19.00.**

УНП 100377901

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС “МІР”

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• **Майстар-клас па размалёўванні навагодніх упрыгожанняў. 27 снежня ў 12.00.**
• Дзіцячы калядны баль **“Зімовая казка”**. Партрэтная зала. **5 студзеня ў 12.00 і 15.00.**
• Часовая экспазіцыя **“Жыццё без меж”**, прысвечаная творчасці людзей з асаблівымі патрэбамі. **Да 19 студзеня.**
• Экспазіцыя **“Арсенал: ваенная зброя ў гістарычным кантэксце”**. Сумесны праект з Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем. Паўночны корпус. **Да 22 кастрычніка.**
• **Лекцыя-візуалізацыя. Кожную сераду і суботу.**
• Экспазіцыя **“Войны XX стагоддзя. Гета ў Мірскім замку”**.
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **“Інтрыгі Купідона”**.
• Сямейная квэст-экскурсія **“Легенды і паданні Мірскага замка”**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **“Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце”, “Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.”, “Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.”, “Печы з каробкавай кафлі XVI–XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў”**.

УНП 590201541

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163**, **8 025 6677819**.

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК “НЯСВІЖ”

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• Тэатралізаваная экскурсія **“Тэатральны экспромт”**. **28–29 снежня з 12.00.**
• Культурнае мерапрыемства **“Новы год у палацы”**. **2–4 студзеня з 12.00 да 19.00.**
• Канцэрт **“Калядны джаз”**. **5 студзеня ў 15.00 і 17.00.**
• Дзіцячы спектакль **“Падарунак для зорачкі”**. **6 студзеня ў 13.00 і 15.00.**
• Часовая экспазіцыя **“Звяжам свет прыгажосцю”**. Калекцыйная зала “Нумізматыка і фалерыстыка”. **Да 26 студзеня.**
• Экспазіцыя ёлачных цацак і ўпрыгожанняў **“Калі запальваюцца ёлкі”** з прыватнай калекцыі Наталлі Кавалёвай (Віцебск). Малая выставачная зала. **Да 9 лютага.**
• Экспазіцыйны праект **“Не пакідай мяне, мой светлы сум”** скульптараў Льва і Сяргея Гумілеўскіх. Вялікая выставачная зала. **Да 13 красавіка.**
• Міжнародны выставачны праект **“Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара”. У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Квэст **“Палацавыя таямніцы”**.
• Віртуальныя выставы: **“Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны”, “Нясвіж – здабытак сусветнай культуры”, “Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа”, “Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»”**.
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Інфармацыйна-касавы цэнтр (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)
• Экспазіцыя твораў графікаў **“Мастак – кніга – тэкст”**. **Да 15 студзеня.**

Ратуша
• Часовая экспазіцыя **“Рэгенерацыя гістарычнай часткі г. Нясвіж. Эфектыўнае гарадское асяроддзе”. Да 20 лютага.**

Пастаянныя экспазіцыі
• **“Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII – 1-й палове XIX ст.”.**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX–XX стагоддзяў **“Культура часу”**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **“Безаблічны артэфакт”, “Карта сямі каралеўстваў”, “Музейны дэтэктыў”, “Музейнае расследаванне”**.
• Культурныя мерапрыемствы: **“Прыём у княгіні”, “Дзень нараджэння ў ратушы”** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **“Школа шпіёнаў”** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **“Музейка аб музеі”** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **“Выкрунтасы”** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Экскурсія **“Унікальны свет закулісся Вялікага тэатра Беларусі” (6+). 27 снежня ў 15.30, 28 снежня ў 11.00.**
• Балет у 2 дзеях **“Шчаўкунок” (6+). 27 снежня ў 19.00, 29 снежня ў 18.00, 31 снежня ў 17.00, 5 студзеня ў 18.00.**
• Канцэрт **“Навагодні агеньчык” (12+)**. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **27 снежня ў 19.30, 29 снежня ў 18.30, 3 студзеня ў 19.30, 5 студзеня ў 18.30.**
• Аперэта ў 3 дзеях **“Лятучая мыш” (12+). 28 снежня ў 18.00.**
• Опера ў 2 дзеях **“Гісторыя Кая і Герды” (“Снежная каралева”) (6+)**. Перад спектаклем – навагодняе прадстаўленне ў фае тэатра. **4 студзеня ў 11.00 і 18.00.**

УНП 191081322

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава ёлачных рэтрацацак **“Цацкі, якія захоўваюць памяць”. Да 12 студзеня.**
• Майстар-клас **“Гісторыя радыё і азбукі Морзэ” (10+)**. Абавязковая рэгістрацыя па тэл. 8 017 2030792.
• Часовая экспазіцыя “Музей, якому служыш”, прысвечаная 80-годдзю ўстановы.
• Часовая экспазіцыя “Адзінай памяці верныя”, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі.

Падрабязнасці ў сацыяльных сетках і на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Някрасава, 3,
тэл.: 8 017 2350331,
час працы: серада – нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выставачны праект **“Трыяда. Скульптура – архітэктура – горад”. Да 2 лютага.**
• Выстава Сяргея Дажджа **“АБСТРАШКА і абстрактная АЗБУКА”. Да 2 лютага.**
• Выстава твораў з фонду НЦСМ **“Цёплыя стасункі”. Да 16 лютага.**
• Персанальная выстава Аляксандра Трускоўскага **“[Не]асабістае пытанне”. Да 16 лютага.**

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2350332, 8 017 3990978,
час працы: аўторак – нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выстава **“Рэха мадэрнізму. Ад Манэ да Кандзінскага”. Да 19 студзеня.**

УНП 192543414

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР “ЛЯЛЬКА”

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Святочная праграма **“З Новым годам, добры Гном!”**, танцавальна-забаўляльная праграма **“Гнамуляндыя танцуе зноў” (3+)**. Глядзельная зала і фае тэатра. **27 снежня ў 11.00, 14.00 і 17.30, 28 снежня ў 11.00, 14.00 і 17.30, 29 снежня ў 11.00, 14.00 і 17.30, 30 снежня ў 11.00, 14.00 і 17.30, 2 студзеня ў 11.00, 14.00 і 17.30, 3 студзеня ў 14.00 і 17.30, 4 студзеня ў 11.00 і 14.00, 5 студзеня ў 14.00.**

УНП 300001869

t.me/kultinfa

Карыстаецеся стыкерамі ў анлайн-ліставанні і хочаце папоўніць сваю калекцыю? Прапануем стыкерпак ад “Культуры”! Выказаць эмоцыі вам дапамогуць класікі беларускай літаратуры. Выбірайце самую трапную цытату — і здзіўляйце суразмоўцаў у Telegram!

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура": Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактар аддзела — Віктар ГАЎРЫШ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.

Ільготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).

Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Набыць газету ў Мінску можна ў крамах "Белдрук" на пр-це Незалежнасці, 48, і Пераможцаў, 5, на вул. Лабанка, 2, Валадарскага, 16, Няміга, 30, Леніна, 18, Максіма Багдановіча (ля прыпынку "Ст. м. «Няміга»"), у падземных пераходах на плошчы Перамогі і станцыі метро "Пятроўшчына".

Падпісана ў друк 24.12.2024 у 16.00. Замова № 2720. Наклад 3555.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2024.

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.